# АРХЕАЛОГІЯ І ФІЗІЧНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ У ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ

**УДК 903.02 (476.5-21)„10”**

## НЕКАТОРЫЯ ЗАЎВАГІ АДНОСНА БАЛГАРСКАГА ЎПЛЫВУ НА КЕРАМІЧНУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ ПОЛАЦКА Ў XI ст.

***канд. гіст. навук М.В. КЛІМАЎ***
**Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск**

*Разглядаецца версія аб магчымасці вырабу керамічнага посуду ў Полацку ганчарамі-перасяленцамі з тэрыторыі Балгарыі. Прыводзіцца фармалагічны аналіз некаторых тыпаў керамічнага посуду з тэрыторыі Балгарыі і феадальнай сядзібы I, змешчанай у межах помніка Лучна-1.*

Версія адносна “балгарскага следу” ў керамічнай вытворчасці Полацка была вылучана С.В. Тарасавым у сувязі з праблемай ідэнтыфікацыі клеймаў. Даследчык прыйшоў да высновы аб тым, што ў Полацку маглі працаваць балгарскія ганчары. “Гаворачы аб балгарах-перасяленцах, мы маем на ўвазе менавіта носьбітаў традыцыі, а не скажам, прывоз імпартных гаршчкоў з Балгарыі” – падкрэсліваў даследчык [1, с. 128]. У аснову версіі легла гіпотэза аб “неперапрацаваных” сюжэтах на ганчарных клеймах, якія даследчык звязваў з Балгарыяй.

Выказанае меркаванне С.В. Тарасава вельмі слушнае, бо ўлічвае не толькі лакальныя прыкметы адносна клеймаў на гаршках, але і шэраг іншых праяў дадзенага ўплыву, у тым ліку і ў архітэктуры [2, с. 10–12]. Разам з тым вельмі складана пацвердзіць данную версію. Сляды майстэрні, дзе маглі працаваць, менавіта ганчары-балгары ў Полацку не знойдзены, як і майстэрні звычайных майстроў-керамістаў XI ст. Не маем нажаль і сапраўдных прыкладаў балгарскай керамікі, каб зрабіць шліфы з балгарскай і полацкай керамікі XI ст. і пры дапамозе мікраскопа ўбачыць ідэнтычнасць у прыгатаванні фармовачнай масы. Таму поўнавартасны марфалагічны аналіз пакуль не магчымы. У гэтай сувязі выкажам меркаванне аб малой верагоднасці таго, што ў фрагментах керамікі, якая належыла да вытворчасці балгар-керамістаў, перасяліўшыхся ў Полацк, будзе адсутнічаць у керамічнай масе дамешак пяску. Падобнае меркаванне грунтуецца на перакананні ў тым, што, нягледзячы на розніцу ў тэхналогіях вытворчасці ў Балгарыі і ў Полацку, у XI ст. малаверагодна каб балгарскія перасяленцы захавалі нязменнай тэхналогію вытворчасці. Яны вымушаны былі прыстасоўвацца да існуючых рэалій керамічнай вытворчасці, “панiжаць свой тэхналагічны ўзровень”, захоўваючы, у асноўным, форму гаршкоў, якая не магла быць нязменнай і ўтрымлівала ўплывы з боку полацкіх керамістаў, у тым ліку. Таму знайсці дакладна “балгарскую” кераміку, зробленую ў Полацку, не ўяўляецца пакуль магчымым. Калі б былі прааналізаваны калекцыі керамічнага посуду з Полацка выключна з пласта XI ст., то верагодна былі б выяўлены фрагменты, якія ўтрымлівалі меншы працэнт дамешка пяску і адрозніваліся па якасці абпалу ў лепшы бок, што выдавала б больш высокі тэхналагічны ўзровень, носьбітамі якога і трэба было б прызнаць балгарскіх перасяленцаў. Але падобная праца адносна керамічных калекцый праведзена не была, таму разважаць надалей магчыма ў накірунку фармалагічных аспектаў керамічнай вытворчасці XI ст.

Звяртаючыся да фармалагічнага аналізу, неабходна ўказаць на існаванне магчымасці з боку мясцовых майстроў-керамістаў па ўнясенні ў традыцыйную форму полацкіх гаршкоў пад уплывам перасяленцаў некаторых інавацый, якія, па нашаму меркаванню, датычыліся некаторых змен формы гаршка, асабліва, мадуляцыі верхняй часткі профіля шыйкі і венца. Падобныя змены, верагодна, падлягаюць выяўленню, як формы, не характэрныя для керамічных серый з іншых рэгіёнаў. Асаблівасцю “мадыфікаваных” тыпаў гаршкоў неабходна прызнаць і іх адносна вузкае распаўсюджанне нават у Полацку. Такім чынам, пакуль не знойдзена майстэрня ў якой працавалі балгары-перасяленцы, магчыма казаць толькі аб пошуку фармалагічных прыкмет даннай керамікі, якая не магла быць цалкам ідэнтычнай балгарскай, а павінна была несці некаторыя фармалагічныя прыкметы такога посуду. Для пошуку ўказанай керамікі не дастаткова было проста знаходзіць фрагменты, а неабходна было мець закрытыя комплексы, у якіх падобная кераміка вылучалася б сярод іншай. Храналогія вылучаных для вывучэння керамічных матэрыялаў комплексаў павінна была адпавядаць храналогіі, пазнейшай чым 1018 год – год заваявання Візантыяй Балгарыі і пачатку эміграцыі балгар.

Зыходзячы з дадзеных крытэрыяў, нашу ўвагу прыцягнулі комплексы феадальнай сядзібы I помніка Лучна-1. Помнік Лучна-1, змешчаны за 12 км ад Полацка, дастаткова разгледжаны ў навуковай літаратуры. У межах помніка з XI да XVI стст. паслядоўна існавалі комплексы трох феадальных сядзіб, двух грунтовых могіль-нікаў. Таму вельмі важнае значэнне мела параўнаўчая характарыстыка серый артэфактаў з помніка Лучна-1 і Полацка, што дазволіла казаць аб фрагментарнасці выбаркі асобных артэ-

фактаў [3, с. 60]. У межах згаданай вышэй характарыстыкі параўнанне керамічнага посуду XI ст. з Лучна-1 і Полацка не праводзілася. У сувязі з прадстаўленай тэмай з'явілася неабходнасць звярнуць увагу на параўнаўчую характарыстыку керамічнага посуду з комплекса феадальнай сядзібы I, існаванне якой адпавядае часу **сярэдзіны – 2-й паловы XI ст**. і тыпам керамікі з Полацка. Менавіта храналогія комплексаў феадальнай сядзібы I і прыцягнула нашу ўвагу адносна вышэй акрэсленай задачы па пошуку і ідэнтыфікацыі "балгарскага ўплыву" на керамічную вытворчасць Полацка, бо пры адсутнасці слядоў вытворчасці керамічнага посуду ў дадзены перыяд у Лучна, заканамерна меркаваць аб яго паступленні з Полацка, таму керамічны посуд мясцовай вытворчасці, выяўлены ў межах феадальнай сядзібы I, неабходна прызнаць полацкім па паходжанні.

Нягледзячы на тое, што доследы помніка Лучна-1 вяліся з 1998-га года, комплексы сядзібы I былі ідэнтыфікаваны толькі ў снежні 2011 г. падчас доследаў раскопа XII [4, с. 362, рис. 1]. У сувязі з тым, што на месцы гэтай сядзібы ў пазнейшы час існавалі іншыя паселішчы дакладна меркаваць аб сядзібе дазваляў толькі змест мацерыковых ям, якія вылучаліся на фоне жоўтага мацерыковага пяску ў выглядзе цёмна-шэрых, чорных плям, бо змест комплексаў складаўся з перапаленых камянёў, пакінутых ад агнішчаў і іншых артэфактаў, сярод якіх вылучаліся керамічныя матэрыялы. Ва ўсіх комплексах пры-сутнічалі фрагменты амфар, адметныя венцы керамікі і іншыя прадметы. Так, з комплекса № 727, напрыклад, паходзілі фрагменты іголкі і бранзалет, а таксама донца гаршка з **пяцікутнай зоркай у коле** – выява вельмі рэдкага ганчарнага кляйма (мал. 1: *1*). Такім чынам, амфары і венцы гаршкоў прысутнічалі ў комплексах № 605, 727, 728, 735 і часткова ў № 652 і 658. Асаблівасці гаршкоў з комплексаў падкрэсліваліся наяўнасцю трох відаў афармлення донцаў: 1) донца без падсыпкі, плоскае, з кляймом ў выглядзе зоркі (мал. 1: *1*); 2) плоскае донца, без кляйма, з падсыпкай пяску (мал. 1: *2, 3*); 3) донца вогнутае ўнутр, без падсыпкі (мал. 1: *4*). Розніца паміж донцамі тлумачыцца тым, што ў межах комплексаў знаходзіўся посуд з некалькіх керамічных партый, якія паступілі на помнік ў пэўны храна-лагічны перыяд. Даннае меркаванне пацвярджае і варыятыўнасць тыпаў венцаў гаршкоў.




Мал. 1. Тыпы донцаў гаршкоў з комлексаў феадальнай сядзібы I, помніка Лучна-1

Сярод указаных венцаў вылучаецца дзве ўмоўных групы. Венцы I-й групы добра прадстаўлены ў полацкіх матэрыялах (мал. 2: *I*). Венцы II-й групы вызначаюцца сваёй адметнасцю, яны сярод полацкіх матэрыялаў сустракаюцца не часта (мал. 2: *II*). З ліку венцаў групы II вылучаюцца венцы ў якіх бачны наступныя рысы: **нахіл венца ва ўнутраны бок; шырокая шыйка; істотны выгін венца вонкі.** Не ва ўсіх венцах дадзеныя рысы спалучаюцца адначасова. Разам з тым ідэнтыфікацыя шэрагу паказаных венцаў выклікае пытанні. Бо адносна венцаў групы I пытанне ідэнтыфікацыі амаль адсутнічае. Напрыклад, венца S-падобнага профіля з рэзкім пераходам ад шыйкі да плячука, якое сустрэта ў комплексах сядзібы I (мал. 2: *I, 2*), адзначаецца як адзін з тыпаў (Д) сярод керамічных матэрыялаў Полацкага гарадзішча з храналагічнымі межамі бытавання XI–XIII стст. [5, с. 51, мал. 2]. Але іншыя венцы (асабліва группы II) з комплексаў сядзібы I не прадстаўлены ў дадзенай класіфікацыі, як і ў класіфікацыі Г.В. Штыхава [6, с. 81–82, рис. 40]. Адсутнасць падобнай керамікі ў згаданых вышэй класіфікацыйных схемах, відавочна, звязана з тым, што вылучаныя тыпы керамікі I групы сустракаліся ў межах даследаванай плошчы ў малой колькасці і, верагодна, адсутнічалі ў закрытых комплексах, аналагічных па ўмовах фарміравання лучнянскім.




Мал. 2. Асноўныя тыпы венцаў гаршкоў з комплексаў феадальнай сядзібы I, помніка Лучна-1

На помніку Лучна-1 кераміка, выяўленая ў межах комплексаў феадальнай сядзібы I, адсутнічала і ў пазнейшых комплексах феадальнай сядзібы II, якая ўзнікла ў 1-й палове XII ст. і існавала да 1-й паловы XIII стст. Керамічныя гаршкі з феадальнай сядзібы II не з'яўляліся выключнымі, сярод іх пераважалі два асноўных тыпа: 1. Тып, які характарызаваўся афармленнем выступа шыйкі ва ўнутраным накірунку з фарміраваннем завяршэння венца пад накрыўку (мал. 3: *А*). 2. Тып са спрамленым профілем венца (мал. 3: *Б*). У адрозненні ад венцаў I-й керамічнай групы (сядзіба I) венцы феадальнай сядзібы II добра вядомы і ў сінхронных комплексах на тэрыторыі Украіны, Пскова і іншых рэгіёнаў [7, с. 35–37, рис. 24; 8 с. 308, рис. 1]. Такім чынам, керамічны комплекс з ям феадальнай сядзібы I адлюстроўваў пэўны этап керамічнай вытворчасці, які не выходзіў за 1-ю палову XII ст. Фіксацыя дадзеных асаблівасцяў у храналогіі бытавання посуду дазваляе зрабіць выснову аб тым, што пры далейшай пабудове храналогіі керамікі Полацка неабходна звяртаць увагу не на шырокія храналагічныя рамкі бытавання, абазначаныя як XI–XIII стст., выяўленыя статыстычна па прысутнасці ў пластах, а на знаходжанне пэўных тыпаў у закрытых комплексах, у якіх пазбягалася такая з'ява, як інфільтрацыя фрагментаў керамікі паміж асобнымі напластаваннямі. '




Мал. 3. Асноўыя тыпы венцаў гаршкоў з комлексаў феадальнай сядзібы II, помніка Лучна-1

PolotskSU

Пошукі асаблівасцяў, адзначаных сярод 2-й групы керамікі, насілі складаны характар. Заўважым, што ў класіфікацыйных схемах венцы з адзначанымі прыкметамі амаль адсутнічаюць. Напрыклад, калі мы звернімся да тыпалогіі Ю.А. Зайца ці В.М. Ляўко [9, с. 76–77, рис. 55; 10, рис. 2, 3]. Пошук у суседзяў таксама не меў асаблівага поспеху. Напрыклад на паселішчы Лескове, даследаваным О.В. Шекуном і О.В. Вераймечыкам на плошчы 13825 кв.м. на тэрыторыі Чарнігаўскай вобласці падобныя профілі з групы II адсутнічалі. Дастаткова прааналізаваць венцы 2-га (сярэдзіна X – сярэдзіна XI ст.), 3-га (2-я палова XI – пачатак XII ст.) перыядаў жыццядзейнасці на дадзеным паселішчы, каб у гэтым упэўніцца [11, с. 11–21, рис. 23–41].

У сувязі з праблемай ідэнтыфікацыі керамікі з феадальнай сядзібы I помніка Лучна-1 была звернута ўвага на публікацыю Барыса Д. Барысава адносна змен у кераміцы паўночна-усходняй Фракіі – часткі Балгарыі [12, с. 131–132, рис. 1]. У публікацыі прасочваюцца змены ў керамічным посудзе, якія адбыліся ў сувязі з Візантыйскім заваяваннем. На прыведзеным ілюстратыўным матэрыяле дадзеныя змены відавочны. Безумоўна, нельга на аснове публікацыі весці гаворку аб ўсім характары балгарскай керамікі, тым больш, што ў межах класіфікацыі венцаў керамікі, аднесенай да перыяду перад візантыйскім заваяваннем вылучаюцца венцы, блізкія да шыракараспаўсюджаных на тэрыторыі Усходняй Еўропы тыпаў, змененых пад уплывам мясцовых традыцый (мал. 4: *I*), а таксама тыпы, якія прыцягнулі нашу ўвагу па двух фармалагічных прыкметах: нахілу венца ўнутр з рэзка адстаўленай вонкі верхняй часткай венца (мал. 4: *II, А*) і падоўжанай шыйкай (мал. 4: *II, Б*). Пры фармалагічным параўнанні дадзеных рыс з керамікай з феадальнай сядзібы I было заўважана пэўнае іх падабенства ў кераміцы з Лучна. Але будзе памылковым лічыць, што перад намі венцы керамікі, ідэнтычныя балгарскай. У дадзеным выпадку ідзе гаворка аб тым, што пэўныя рысы керамікі з комплексаў Лучна-1 маглі сфарміравацца пад уплывам перасяленцаў з Балгарыі, якія працавалі ў Полацку і адкуль кераміка паступала ў межы феадальнай сядзібы I. Перасяленцы, як гэта ўжо ўказвалася вышэй, не захоўвалі цалкам фармалагічныя прыкметы таго керамічнага посуду, які выраблялі ў Балгарыі, але ў сукупнасці з традыцыямі мясцовых ганчароў спрыялі з'яўленню новых адметных форм керамікі. Гэтай практыцы ўскосна садзейнічала тое, што наменклатура керамічнага посуду, які пакупаўся мясцовымі жыхарамі, істотна адрознівалася ад наменклатуры посуду, якая выраблялася ў Балгарыі, што прымушала ганчароў-перасяленцаў прыстасоўвацца да мясцовых форм посуду. Тое ж адбывалася і з мясцовымі ганчарамі, якія маглі ўспрымаць традыцыі прышлых майстроў толькі часткова.




Мал. 4. Фармалагічны аналіз тыпаў балгарскай керамікі,
апублікаванай Барысам Д. Барысавым (*паводле: Борис Д. Борисов, 1997, рис. 1*)

Такім чынам, дадзеная гіпотэза адносна ўплыва балгараў-перасяленцаў на керамічную вытворчасць Полацка ў XI ст. яшчэ да канца не пацверджана, але пастаноўка праблемы, у якой робіцца акцэнтацыя на адметных рысах керамікі застаецца актуальнай пры будучай распрацоўцы тэмы. Нажаль, не магчымы поўны фармалагічны аналіз керамікі, яна трапляецца ў фрагментах, але па ўскосных дадзеных магчыма меркаваць, што існавалі і сутыкаліся некаторыя тра-дыцыі і тэхналогіі, напрыклад, як гэта

бачна па донцах з комплекса ямы № 728, дзе прысутнічалі фраг-менты донцаў з падсыпкай і без падсыпкі пяску. Напрыклад, у кераміцы з тэрыторыі Балгарыі таксама донцы падсыпалі пяском [Борис Д. Борисов, 1997, с. 131–132, рис. 1]. Таму галоўным было паставіць праблему пошуку "балгарскай керамікі", акрэсліць фармалагічны падыход да гэтага працэса і вызначыць накірунак далейшага даследавання праблемы, а не імкнуцца адказаць на пытанне, знойдзена балгарская кераміка ў Полацку ці не знойдзена.

ЛІТАРАТУРА


1. Тарасаў, С.В. Ганчарныя клеймы: паралелі і храналогія / С.В. Тарасаў // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплмнарных даследаванняў : зб. навук. прац міжнар. навук.-практ. канф, прысвечанай 160-годдзю з дня нар. А.П. Сапунова, Полацк, 21–23 крас. 2011 г. : у 2 ч. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. – С. 125–130.
2. Тарасаў, С.В. Старажытны Полацк: балканскі след / С.В. Тарасаў // Беларус. гіст. часоп. – 2012,*б* – № 5. – С. 9–19.
3. Клімаў, М.В. Параўнальны аналіз асноўных катэгорый артэфактаў з Полацка і Лучна / М.В. Клімаў // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VI Міжнар. нав. канф., 1–3 ліст. 2012 г. : у 2 ч. – Полацк : НПГКМЗ, 2013. – Ч. 1. – С. 159–172.
4. Клімаў, М.В. Завяршэнне археалагічных доследаў на помніку Лучна-1 / М.В. Клімаў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. –2013. – № 24. – 2013. С. 362 –367.
5. Дук, Д.У. Культурны пласт Полацка IX – XVIII стст. і бытавая кераміка / Д.У. Дук // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб-к навук. прац міжнар. навук.-практ. канф, прысвечанай 160-годдзю з дня нар. А. П. Сапунова, Полацк, 21–23 крас. 2011 г. : у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 1. –С. 47–54.
6. Штыхов, Г. В. Древний Полоцк / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1975. – 135 с.
7. Прищепа, Б. Дорогобуж на Горині у Х–ХІІІ ст. / Б. Прищепа. – Рівне : ПП ДМ, 2011. – 250 с.
8. Кильдюшевский, В.И. Традиционность в материальной культуре русской провинции позднего средневековья / В.И. Кильдюшевский, А.В. Курбатов // Тверской археологический сборник. – Вып. 4. Т. 2. Материалы II Тверской археологической конф. и 5-го Заседания науч. семинара «Тверская земля и сопредельные территории в древности». – Тверь, 2001. – С. 307–315.
9. Заяц, Ю.А. Заславль в эпоху феодализма / Ю.А. Заяц. – Минск : Наука и техника, 1995. – 207 с.
10. Левко, О.Н. Средневековое гончарство Северо-восточной Белоруссии / О.Н. Левко. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 164 с.
11. Шекун, О.В. Давньоруське поселення Ліскове / О.В. Шекун, О.М. Веремейчик. – Чернігів : РВК "Деснянська правда", 1999. – 184 с.
12. Борисов, Борис Д. Основные этапы в развитии системы поселенийСеверо-восточной Фракии в XI–XII вв. / Борис Д. Борисов // Труды VI Междунар. конресса славянской археологии, Новгород 26–31 августа 1996 г. – Т. 1. Проблемы славянской археологии. – М., 1997. – С. 130–139.


## SOME COMMENTS ON THE BULGARIAN IMPACT ON CERAMIC PRODUCTION OF POLOTSK IN THE XI CENTURY

***M. KLIMOV***

*The author considers the version of the possibility of production of ceramic tableware in Polotsk by potters settlers from the territory of Bulgaria. The analysis of some types of pottery from the territory of Bulgaria and the feudal manor I situated within the monument Luchna-1 is presented.*

PolotskSU